нага тавару. У новых рыначных умовах опажвец гатовы купіць каштоўныя ПП і заплаціць за іх столькі, колькі яны таго каштуюць. ПП у такіх умовах пачынаюць функцыяніраваць як тавар.

## ДА ПЫТАННЯ АБ СТАНОВІШЧЫ ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ У СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Н.П.Галіцкая

Нацыянальны фальклор, развіваюсь на глебе сялянскага укладу, перажыў к наступнаму часу працяглы перыяд эвалюцыі. Пры гэтым змяняюцца яго функцыі і задачы. Калі ў эпоху язычных веравання значную ролю іграла магічная функцыя фальклору, то ў наступны час яна, зразумела, страчана. Функцыі ж выхаваўчая і камунікатыўная засталіся. Яшчэ адна функцыя фальклору – эстэтычная, мае зусім іншае, асаблівае развіццё ў эвалюцыі нацыянальнай песнятворчасці. З часам яна ўсе больш вылучаецца на першы план і зараз з'яўляецца адной з галоўных.

Сучаснае становішча беларускай народнай творчасці сведчыць аб складаных і супярэчлівых працэсах у народным побыце. У музычным жыцці горада і вескі назіраюцца шматлікія факты ўзаемаўплыву народнай і прафесійнай музыкі. У горадзе і некаторых гарадскіх прыгарадах магчыма адзначыць частковае адыходжанне народнай музычнай культуры на другі план у параўнанні з прафесійнай (часцей за ўсе – лёгкай музыкай). І наадварот, роля прафесійная музыкі ў жыцці людзей прыкметна ўзрастае ў вялікіх гарадах, у параўнанні з прыгарадам і вёскай. І ўсе ж, у сучасным рэпертуары па-ранейшаму жывуць старадаўнія народныя песні. Іх жыццевая моц – у агульначалавечым змесце. Эстэтычная каштоўнасць фальклору бясспрэчна.

Абагульняючы ўсе сказанае вышэй, адзначым, што ў новых гістарычных умовах формы існавання традыцыйнай народнай песні грунтоўна змяніліся. Калі ў дарэвалюцыйны перыяд галоўнай формай існавання традыцыйнай песні было яе натуральнае жыцце ў побыце, то ўжо ў канцы дзевятнаццатага, пачатку дваццатага стагоддзя с зараджэннем першых калектываў мастацкай самадзейнасці тра-

дыцыйная песня нярэдка стала выконвацца са сцэны. Такім чынам, паралельна з традыцыйнай формай выканання песеннага фальклору развіваецца і канцэртна-арганізацыйная форма.

Ступень захоўвання традыцыйных песень у рэпертуары людзей рознага ўзросту неаднолькавая: так, большая іх колькасць захавалася ў рэпертуары людзей старэйшага пакалення. Часткова ведаюць традыцыйныя песні, а таксама іх і выконваюць людзі сярэдняга ўзросту.

Песні часцей за ўсе гучаць у вёсцы ў дні святаў, як агульных, так і сямейных, а таксама ў нядзелю. Спяваюць звычайна групамі, дзе вызначаюцца, як правіла, адзін-два выканаўцы, вядучых асноўную партыю. Другой формай бытавання і выканання народных песень з'яўляецца, як ужо гаварылася раней, канцэртна-арганізацыйная форма выканання народных мелодый, што наглядна назіраецца ў харавых калектывах мастацкай самадзейнасці. Пераход песні з натуральных умоў на сцэну ёсць пераход не ў якасна новы стан. Пры гэтым яна, як правіла, мае іншую творчую апрацоўку, так як умовы канцэртнага выканання значна адрозніваюцца ад тых умоў, у якіх існуе фальклор у паўсядзённым побыце. Так, народная песня ў канцэртнай інтэрпрэтацыі нярэдка набывае куплетную форму (замест першапачатковай варыянтнасці строф). Страты, звязаныя са сцэнічным выкананнем традыцыйнай песні, часткова кампенсуюцца і некаторым набыткам: пераадольваецца вядомая замкнёнасць у ранейшых геаграфічных межах, пашыраецца абсяг культурна-песенных сувязяў і гэтак далей.

Нацыянальны фальклор, маючы сталую каштоўнасць, як выдатнейшая з'ява народнай культуры, амаль існавання ва ўмовах нашага часу ў якасці творчага матэрыялу для мастацкай самадзейнасці, можа таксама існаваць у выглядзе ўключэння рада яго элементаў у сучасную святочную абраднасць. Як сведчыць мноства сацыялагічных прац па выяўленню мастацкіх запатрабаванняў вясковага насельніцтва, сучасныя абрады і святы задавальняюць, у першую чаргу, патрабаванні яго ў радасці, як калектыўным перажыванні. Не меньш значным з'явілася і патрабаванне ў масавых зносінах у святочныя дні, а таксама патрабаванне задавальнення вольнага часу і г.д. Як бачым, свята бяспрэчна мае складаную поліфункцыянальнасць і здольна задаволіць вялікі спектр грамадс-

кіх і асабістых запатрабаванняў вясковага насельніцтва. Для далейшага развіцця і ўдасканалення сучаснай культуры бяспрэчна важным з'яўляецца шырокае выкарыстанне народных традыцый у жыцці нашага грамадства. Усе ўзрастаючая цікавасць да нацыянальных форм культуры, да народных традыцый робяць вельмі вострым пытанне аб сучаснай прапагандзе нацыянальнага фальклору. У прыватнасці ў справе фальклорнай прапаганды, акрамя фальклорных фестываляў, канцэртаў, святаў народных спевакоў і выканаўцаў, неабходна больш шырокае выкарыстанне і сродкаў масавай інфармацыі: часцей арганізоўваць і перадаваць па радыё, тэлебачанню сустрэчы, інтэрв'ю, агляды-конкурсы фальклорных і фальклорна-этнаграфічных калектываў. Больш шырокае і актыўнае правядзенне масавых мерапрыемстваў па прапагандзе нацыянальнага фальклору безумоўна будзе садзейнічаць захаванню і ўдасканаленню народных традыцый.

## РЫНАК І САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КУЛЬТУРЫ

А.У.Рак

Ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі трэба адзначыць недасканаласць рынка сацыяльна-культурных даброт і паслуг, які фарміруецца ў сучасны перыяд.

Па-першае, па шмат якім відам культурных даброт і паслуг попыт перавышае прапанову.

Па-другое, захоўваецца манапалізаванае становішча многіх прадпрыемстваў і устаноў культуры ў адносінах да насельніцтва, да спажыўцоў культурных паслуг, што выяўляецца ў павышэнні цэн, у скарачэнні аб'емаў бясплатных паслуг.

Па-трэцяе, адсутнічае канкурэнцыя паміж вытворцамі. У галіне культуры прыстасаванне да спажывецкага попыта ажыццяўляецца вельмі марудна.

Між тым у рыначнай эканоміцы (і ў гэтым адна з яе перавагі) пакупнік вылучае свае патрабаванні да тавару, а вытворца павінен прыстасоўвацца да запатрабаванняў спажыўцоў, а не наадварот. Такім чынам, ажыццяўляецца разнастайнасць прапановы, або


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ